Сяргей Новік-Пяюн

ЗАЎСЁДЫ З ПЕСНЯЙ



Сяргей Новік-Пяюн

ЗАЎСЁДЫ З ПЕСНЯЙ

ПАЭМА, ВЕРШЫ, ПЕСНІ,
ТВОРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1984

Бел 2
Н 73

Рэцэнзент Янка Саламевіч

Н $\frac{4702120200-062}{М 302(05)-84}$ 64—84

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1984.

ПЕСНЯ КЛІКАЛА У СВЕТ

Кніжка гэтая незвычайнага складу, як незвычайны лёс яе аўтара. Ён нарадзіўся здольны маляваць, кампанаваць музыку, складаць словы ў вершы і песні, прагны слова песеннага, слова роднага. І на старонках гэтай кнігі вы ўбачыце спробы яго пэндзля, і прачытаеце вершы, прытым і дзіцячыя, бо дзеці — будучае любога часу, любога народа.

А пачынаў ён ва ўсіх умовах былой Заходняй Беларусі канца 20-х гадоў — пачынаў пад уплывам грамадскага руху — сялянска-работніцкай Грамады, якая ў былой буржуазна-памешчыцкай Польшчы ўзначальвала рэвалюцыйную і нацыянальна-вызваленчую барацьбу працоўных былой Заходняй Беларусі. Грамадскі рух быў пад уплывам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Але да канца 20-х гадоў ён быў у буржуазна-памешчыцкай Польшчы здушаны. Ужо ў часы разгрому яе пачынаў юнак, у час разгулу рэпрэсій. І гэта шмат у чым прадвызначыла будучае юнака.

Толькі дваццаць гадоў мінула яму. Ён быў родам з Лявонавіч, што на Нясвіжчыне. Ён быў гімназістам. І ён не мог не апынуцца сярод тых, каго захапілі бурныя хвалі грамадаўскага руху, які быў увесь у цязе і да рэвалюцыйнага дзеяння, і да прасветы, культуры, мастацтва. Да роднае песні цягнулася душа народа — да песні бунтарнае, грамадаўскае і да песні народнае, якую спаконвеку спявалі ў Лявонавічах. Спявалі там яе

дзяўчаты — у паасобку, жанкі — у паасобку, хлопцы ды мужчыны — у паасобку. А тут раптам заспявалі яны ўсе разам, аб'яднаныя ў адзіным Лявонавіцкім хоры — хоры, што як народны вядомы і сёння. Заснавальнікам жа яго, першым кіраўніком гэтага хору быў аўтар вось гэтай кніжкі, тады — юнак з пяючай душой, які і выбраў сабе псеўданімам слова «Пяюн» — слова песеннялявонавіцкае, слова ад песеннай душы сваіх землякоў.

Душа юнака рвалася да песень, а песню глушылі. І вось малады кіраўнік хору ўжо далёка ад Лявонавіч — на Паможы, у высылцы, а на радзіме яму жыць забаронена. Душа юнака, аднак, рвецца на радзіму. У ім якраз тут абуджаецца яшчэ і талент кампазітара. І якраз тут, на Памор'і — у высылцы, на трэцім яе годзе — у 1929 г. Сяргей Пяюн піша словы і складае музыку сваіх «Зорачак» — песні, якая стала шырока папулярнай у Заходняй Беларусі ў даверасн ёўскі час, песні, якую ў першыя пасляваенныя гады Р. Р. Шырма публікаваў як народную песню паланянак, вывезеных фашыстамі на работу ў Германію.

Рознабакова адораны былы кіраўнік Лявонавіцкага хору быў асуджаны панскай высылкай не толькі на адзіноцтва: стаўка паноў была куды больш жорсткай — на загубу яшчэ аднаго з беларускіх Сымонаў-музыкаў. Песняю «Зорачкі» ён, праўда, перамагаў паноў. Але не без перамогі над ім у выніку аказваліся і паны, пазбавіўшы маладога паэта і кампазітара роднага грунту, адарваўшы яго ад перадавых сіл грамадска-палітычнага руху, ад школы палітычнага выхавання як першай з перадумоў развіцця дараванняў, грамадзянскага мужнення, арыентацыі ў складаным свеце бурных падзей. У гэтым быў пачатак будучых драматычных перыпетый жыцця С. М. Новіка-Пеюна. Гэтым жа няхай чытач вытлумачыць сабе і мастацкую няроўнасць твораў, з якімі пазнаёміцца ў кнізе. Частка з іх — па стылю — у сваім часе: яны гучаць так, як гучала большасць твораў ма-

савай паэзіі перыяду грамадаўскага руху; частка — 40-х, перадваенных год — у духу тагачасных святочна-настраёвых вершаў. Ды яны — з этапаў жыцця чалавечага: з жыцця іх не выкінуць, і з песні гэтага жыцця — таксама. Тым больш што на іх фоне яшчэ ярчэй успыхваюць лепшыя вершы паэта — поўныя драматызму, напрыклад, вершы з фашысцкага астрогу, з калдычаўскага канцлагера. Пра іх вядомы даследчык заходнебеларускай паэзіі У. Калеснік пісаў, што яны «не маюць у беларускай паэзіі прэцэдэнту і ўжо гэтым цікавыя».

Але мы не ўсё расказалі яшчэ пра юнака з Лявонавіч, закінутага ў высылку на Памор'е. Ён не хацеў заставацца адзінокім. Ён шукаў шырокага, вялікага свету і захапіўся эсперанта — захапіўся ім не толькі як модай міжваенных дзесяцігоддзяў, але як міжнароднай мовай, якую вывучалі вязні Лукішак, на якой перастукваліся ахвяры фашысцкіх засценкаў не толькі ў Польшчы. Ён, аднак, вывучаў яе застаючыся песенным лявонаўцам, бо вывучаў і дзеля таго, каб зноў жа скласці і словы і напісаць музыку песні, што стала прызнаным гімнам эсперантыстаў. Гэта быў яшчэ адзін узлёт юнака з Лявонавіч.

Але эсперанта ў слонімскай турме, куды кінулі Новіка-Пеюна фашысты, было мёртвай мовай. На ёй не перагаварваліся і вязні калдычаўскага канцлагера, куды трапіў Сяргей Міхайлавіч затым. Яго песня «Не гудзе зялёная дуброва...» стала песенным помнікам усім ахвярам Калдычава, як і калдычаўскія вершы Новіка-Пеюна наогул.

А, відаць, самыя задушэўныя вершы С. М. Новіка-Пеюна напісаны ім для дзяцей. У заходнебеларускай літаратуры канца 20-х, 30-х гадоў ён быў вядомы і пад псеўданімам Маладога Дзядка. Якраз пад такім псеўданімам ён надрукаваў тады асобнымі кніжкамі свае п'ескі «Ёлка Дзеда Мароза», «Цудоўная ноч», «Пакой у Наймы», «Прадка пад крыжам». Той жа псеўданім

можна было сустрэць і ледзь не ў кожным нумары заходнебеларускага дзіцячага часопіса «Заранка» (1927—1931 гг.). Выходзіла «Заранка» ў Вільні, рэдагаваная Зоськай Верас (Людвікай Антонаўнай Войцік), а малюнкі ў яе дасылаў у Вільню з Паможа Малады Дзядок — С. М. Новік.

Цяпер Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн — пенсіянер. Ён жыве ў Мінску — на вуліцы Купрыянава, якраз у адным з тых пяціпавярховых будынкаў, паміж якімі разрасліся купчастыя бярозы. Жыве ён у сваёй кватэры сярод кніг і карцін, што сабраны за доўгае жыццё. Частыя яго госці — дзеці, якія прыбягаюць сюды і паслухаць песню, і пачытаць кнігу, і паспрабаваць намаляваць зелянiва вершалін бяроз, што ўжо падступае пад вокны прыветлівага гаспадара кватэры. Ягоны клопат — іх будучае: каб усе іх мары здзейсніліся, усе таленты развіліся. Чалавек, як жыў, так і жыве будучым. Няхай жа ў гэтым будучым будзе і гэтая сціплая кніжка як душэўны след далучэння да роднага слова, след любові да яго, да матчынай песні!..

Алег Лойка

Раздзел першы

РАННІЯ ПЕСНІ

ЗОРАЧКІ

Дні прыходзяць, дні адходзяць, дні лятуць,
Быццам хвалі рэк бурлівых ўдаль бягуць.
Трэці год ужо на выгнанні ў чужыне
Трэба мучыцца душой і сэрцам мне.

Навакол нідзе не ўгледзіш родных хат,
Не працягне рук зычліва родны брат,
Не падзеліш нават думак ні з кім тут,
Не прыгорне ў адзіноцтве родны кут.

Ўночы зорачкі прыветліва мігцяць,
Быццам з неба на мяне яны глядзяць.
Што чуваць, скажыце, зорачкі, вы мне
У маёй роднай ды далёкай старане?

Ці татулька і матулька мае спяць?
Ці таксама на іх зорачкі глядзяць?
Мо' й яны пытаюць зорак аба мне,
Што раблю цяпер ў далёкай чужыне?

Калі толькі мае родныя не спяць,
Калі йшчэ цяпер на зорачкі глядзяць,
Занясіце ім, пакуль не бліснуў свет,
Зоркі мілыя, сыноўскі мой прывет!

І скажыце, каб не плакаў ні адзін,
Што ў выгнанні мусіць мучыцца іх сын!
Прыйдзе, прыйдзе да нас хутка ясны май,
Прыляту тады, як птушка, ў родны край.

З новай верай, з новай сілай зажывём,
Беларускі гімн свой родны запяём,
Гэты гімн, як гром, памчыцца ў аблакі —
Ўсе пазнаюць, што ўжо вольны бедакі.

Сонца з неба будзе край наш саграваць,
Беларусаў ўсіх да працы прабуджаць,
Беларускай песні роднае пад тон
Заарэм мы і засеем свой загон.

Ўночы будзем мы на зоркі паглядаць,
Што, як сёння, ў небе будуць зіхатаць...
Занясіце ж вы, пакуль не бліснуў свет,
Зоркі мілыя, бацькам маім прывет!

1929 г.

ЗІМА

Зіма сярдзітая з марозам,
З завеяй белаю прыйшла,
Дыван прыгожанькі, сняжысты
Да нас з паўночы прынясла.

З-за хмарак выпаўз ціха месяц,
Збірае зоркі ў карагод,
І заблішчэлі, як брыльянты,
На дрэвах іней, снег і лёд.

Ці то ад іх, ці то ад зорак,
Ды відна стала, як удзень,
А шэранькія хаткі вёскі
На белым снезе, нібы цень.

1926 г.

ВЯЧОРКІ

Схапіўшы прасніцу пад паху,
На плечы ўздзеўшы кажушок,
Спяшае дзеўча на вячоркі —
Свой прасці беленькі лянок.

Хоць твар мароз шчыпае злосна,
Ёй і не холадна зусім!
Адна ў ёй думка: на вячорках
Хутчэй сустрэцца са «сваім».

У кутку ля печы лапці з лыка
Пляце старанна гаспадар,—
Для ўсёй сям'і ён мусіць сёння
Зрабіць на заўтра колькі пар.

Каб весялей было дзяўчаткам,
Да іх ужо хлапцы прыйшлі,
Вясёлу песню зацягнулі
Ды байкі правіць пачалі.

Пяюць, жартуюць, весяляцца!..
Мацней гудзе верацяно! —
Пачуўшы гоман гэткі ў хаце,
Падплыў і месяц пад акно.

Глядзеў, дзівіўся ды смяяўся...
Аднак запелі петухі!
Дзяўчаты, хлопцы выйшлі з хаты,
На плечы ўздзеўшы кажухі.

Пасля хлапец сваю дзяўчыну
Завёў да самых да дзвярэй,
І на расстанні кожны моцна
Гарнуў да цёплых да грудзей...

1926 г.

ЧАЛАВЕК І ПТУШКІ

(Паводле А. Пляшчэева)

Дарэмна, птушачкі, мая
Прысутнасць вас трывожыць:
Спявайце смела ўсё, што лёс
На сэрца вам паложыць.

Я не пастаўлю клеткі вам
Ні ў садзе, ані ў полі:
Бо вельмі добра знаю сам,
Што значыць жыць на волі.

1927 г.

ЖЫЦЦЁ

Шкада мне дзён дзяцінных,
Юнацкіх жаль мне дзён,
Якія марна гінуць,
Як сон, як сон, як сон.

Калісь між косаў сонечных
Без думак і клапот
Шчасліва дні і месяцы
Плылі мае ўпярод.

Нішто не верне прошласці! —
За днямі дні бягуць,
Як хвалі мора бурныя,
Удаль плывуць, плывуць.

Ах, сумна, адзінока
Жыццё маё бяжыць,
Удзень, увечар, зрана
Кудысь спяшыць, спяшыць...

1927 г.

ЛІСТАПАД

Але ж я надзею маю:
Восень пройдзе, і тады
Мой народ гурмой спаткае
Жыцця шчасныя гады.

Сонца з хмараў твар пакажа,
Неба скончыць слёзы ліць,

І пазнае сіла ўража,
Што мы зможам вольна жыць!

Хай жа суму ліст далёка
Адляціць ад нас назад!
Волі веру я глыбока,
Хоць навокал лістапад...

1927 г.

НОЧКА

Сонца палючае,
Сонца жывучае
            Скончыла дзённы абход.
Зорачкі ясныя,
Зоркі бліскучыя
            Ў небе вядуць карагод.

Месячык беленькі,
Месячык чысты
            З хмарак свой твар паказаў.
З рэчкі спакойнай,
З рэчкі празрыстай
            Ветрык у клёнах пяяў.

Летняя ночка,
Як маці, калыша
            Стомлены працай народ.
Зорачкі ясныя,
Зоркі бліскучыя
            Свой павялі карагод.

1928 г.

НІВА

Быццам мора шуміць,
Быццам гай шапаціць
Поле — ніва мая каласістая,
Быццам срэбра блішчыць,
Быццам шкло зіхаціць
Сэрца — ніва мая залацістая.

А як жаць прыйдзе час,
Хопіць хлеба у нас:
Каласы збажыны наліваюцца.
Сэрца чую я стук.
А ў паднеб'і жаўрук
Песняй вольнай сваёй залівaецца.

А паміж васількоў,
Залатых матылькоў
Цэлы рой зіхаціць, завіхаецца.
Як зірнеш, паглядзіш,
Вокал — мілая ціш,
Гора-ліха — уміг забываецца.

Будзем жаць, прыйдзе час,
Хопіць хлеба у нас:
Каласы збажыны наліваюцца.
Сэрца чую я стук,
А ў паднеб'і жаўрук
Песняй вольнай сваёй залівaецца.

1927 г.

КАЗКА

У небе срэбнаю касой
Прарэзаў месяц хмуры-хмары,
І паліліся паласой
На дол загадкавыя чары.

Бліснула ў возеры вада,
Як шкло, пры месяцавым ззянні.
І салавейкаў чарада
Распачала свае пяянні.

Лясун заенчыў у бары,
У такт з ім — совіны чароды.
Да самай ранічнай зары
Русалкі водзяць карагоды.

Бо покі срэбнаю касой
Спрэс рэжа месяц цёмны хмары,
Ліюцца сіняй паласой
На дол загадкавыя чары.

1928 г.

МУЗЫКАЙ ВЯСНЯНАЮ...

Музыкай вяснянаю
Разгудзеўся бор,
Песняю жаданаю
Грымнуў птушак хор.

Сонца пасміхаецца
З вышыні нябёс,—
Косы рассыпаюцца
На прылужны плёс.

Краскі, як вясёлачкі,
Водзяць карагод,
Залатыя пчолачкі
П'юць не вып'юць мёд.

Плёсу, лугу радасна —
Не ў зімовым сне,
Песні звоняць шчасныя
Радаснай вясне.

А вы, дзеткі родныя,
У цудоўны май
Песняю чароўнаю
Слаўце родны край!

1929 г.

ЗАСМЯЕЦЦА ВЯСНА

Засмяецца вясна, а з блакітных нябёс
Бліснe коскамі-золатам сонца,
Ўміг прагоніць зіму, што дакучыла нам,
І загляне у наша аконца.

Ад зары да зары над загонам сваім
Спевам жаўранак гожа зальецца...
Вось і ў нашых грудзях пад напевам вясны
Жыва, радасна сэрца заб'ецца.

Пачакайма ж яшчэ: прыйдзе, прыйдзе вясна,
Адпачнем мы ад грозных завеяў.
Лес, лугі зацвітуць, закрасуюць палі,
З поўдня цёпленькі ветрык павее.

1929 г.

Раздзел другі

АСТРОЖНАЯ ЛІРЫКА

СЁННЯ ЎНОЧЫ...

Сёння ўночы пяяў за акном маім вецер,
Снегу мокрага ў шыбы бярэмы кідаў.
Стукацела маркотна халоднае вецце,
Гэта бэзавы куст так ад сцюжы дрыжаў.

Вецер чуў,
што мне ў гэтую ночку не спіцца:
Думкі гоняць няспынна з вачэй маіх сон,
Што наяве галубка мая ўсцяж мне сніцца,
Што чакае душа новых радасных дзён.

Ён аб шчасці пяяў сваім лёгкім павевам,
То к табе поруч з думкай маёю ляцеў,
То гулліва вясёлым бурліў веснапевам,
То кахання магутнага громам грымеў.

Мне здалося, здалёк адгукнулася рэха,
Як жывы воблік твой прада мною стаяў...
Сёння ўночы з дажджом,
                    што званіў ва ўсе стрэхі,
Аб табе, мая радасць, мне вецер пяяў.

1943 г.

НОЧ У ВЯЗНІЦЫ

Чорнаю вужакай сунецца праз краты
У вязніцу нашу студзеньская ноч.
Думкі мае мкнуцца ўсцяж да роднай хаты
І з вачэй няспынна сон зганяюць проч.

Там мая матуля сэрца надрывае,
Лье і ўдзень і ўночы мора горкіх слёз,
Шчыраю малітвай бога заклікае,
Каб хутчэй змяніў ён мой пакутны лёс.

Свет даўно згасілі. Спяць сябры нядолі,
Часам нехта ўсхліпне праз кашмарны сон.
Сняцца ім, напэўна, сны аб светлай волі,
Будучыня сніцца новых, лепшых дзён.

Чорнаю вужакай упаўзла праз краты
У вязніцу нашу студзеньская ноч.
Думкі ўсцяж лунаюць каля роднай хаты
І з вачэй няспынна сон зганяюць проч.

1944 г.

ШЭРЫ ДОМ

О, шэры дом! Нам для пакут
Цябе сам чорт паставіў тут.
Муры твае ўжо колькі год
Няволяць мужны мой народ.

Калі ж нарэшце волі час
Прыйдзе ў наш край, прыйдзе да нас?
Цябе мы знішчым, шэры дом,
Каб успамін здаваўся сном

Аб тым, што тут астрог стаяў,
Які ў нас волю забіраў.
І каб на месцы гэтым ніва
Закаласілася шчасліва.

1944 г.

ЗАБРАЛІ СОНЦА АД МЯНЕ

Забралі сонца ад мяне,
Якое шчыра я любіў,
Што з ранніх дзён свяціла мне,
З якім навек я падружыў.

І за астрожнаю сцяной
Па сябру моцна я тужыў.
Наяве, сне ён быў са мной,
Сустрэцца з ім надзеяй жыў.

І так хацеў вярнуць назад
Дні ўсе мінулыя, гады,
Калі са мной быў друг і брат,
О, залатое сонца, ты!

Нястомна мчыць наперад час,
Хоць слабне сэрца — моцны дух!
Вачэй праменны бліск пагас,
Прамень надзеі — не патух.

Грыміць гісторыі прысуд:
Будзь вольнай, Беларусь мая!
Народ вялікі створыць цуд —
Зноў прывітаю сонца я.

1944 г.

НОЧ У КАМЕРЫ

Месяц чоўнам прыплыў серабрыстым,
Каб з астрога мяне ратаваць,
Паціхутку сярпом залацістым
Мае краты пачаў пілаваць.

Марна мучышся, друг мой каханы!
Не ўцяку я адгэтуль нідзе.
Сам ратуйся, бо стражнік ля брамы
Згледзеў, крыкнуў:
«Стой! Хто ідзе?!»...

Месяц знік, не відно яго болей.
Штось шапочуць зноў зоркі з нябес,
Ды праз шыбы разбітыя з волі
Мне вітанне пахучы шле бэз.

1944 г.

* * *

Шчаслівым будзе той заўсёды,
Вясну хто ў сэрцы захавае,
Душу хто маладую мае,
Шчаслівым будзе той заўсёды.

Хоць іней голаў асыпае,
Хоць стрэнуць мо жыцця нягоды,
Шчаслівым будзе той заўсёды,
Вясну хто ў сэрцы захавае.

1944 г.

* * *

Кажы заўсёды праўду смела,
Хоць, кажуць, праўда коле вочы,
Яна ж нам — светачам ўночы.
Кажы заўсёды праўду смела.

Да працы чэснай будзь ахвочы,
Жыццё каб шчасна праляцела.
Кажы заўсёды праўду смела,
Хоць, кажуць, праўда коле вочы.

1944 г.

БЯРОЗЫ

Пад акном маім бярозы
Ціха веццейкам шумяць,
Льюць сярэбраныя слёзы,
Сум паклаў на іх пячаць.

Што вас змусіла, сяброўкі,
Гэтак горка сумаваць?
Зараз вас у зелень зноўку
Будзе сонца прыбіраць.

Птушкі вам узнагароду —
Новых песняў прынясуць,
Краскі дзіўным карагодам
Ля ног вашых зацвітуць.

Чаму ж вас нішто не цешыць?
Ці згадаць я мушу сам?
Пашто так галінкі вешаць?
Чаму гэтак сумна вам?

Ведаю, мае сястрыцы,
Чаму сум на вас так лёг,
Чаму ў слёзах серабрыцца
Ваша чулае галлё.

Бо я, сябра ваш, нядоляй
Злосна кінуты ў астрог
Ды разлучаны там з воляй,
Хоць нявінна, бачыць бог.

Не сумуйце, кіньце слёзы!
Мука скончыцца мая,
І вас, белыя бярозы,
Прывітаю песняй я.

1944 г.

БЕЛЫ СНЕГ

Ці памятаеш ты:
адно другога мы кахалі,
У даль нязнаную ляцелі мы з табой,
Ні гора, ні бяды тады мы йшчэ не зналі,
Аб шчасці нам званкі пялі пад дугой.

Было так добра нам.
Табе я ў захапленні
Шаптаў кахання словы, бы ў чароўным сне,
І адчуваў твайго я сэрцайка трымценне.—
Тым часам і зямлю пакрыў снег, белы снег.

І сёння, як калісь, імчаць нас коні,
Вясёлыя званкі спяваюць пад дугой.
Віхураю ляцім праз родныя мы гоні,
Пазналі гора шмат, спазналіся з бядой.

Мяцеліца гудзе, мяцеліца галосіць,
Сняжынкаў серабрыцца ў полі белы рой,
А вецер і пяе і з посвістам разносіць
Пух, лебядзіны пух,— сняжынкаў серабро.

Ды хутка ўсё міне:
закончым падарожжа,
Дакончаць нашы коні свой апошні бег,
І нашу маладосць вярнуць ніхто не зможа,
А нашы валасы пакрые белы снег.

1944 г.

НЕ ПАДАЙ ДУХАМ ТЫ НІКОЛІ!

Не падай духам ты ніколі,
З бядой змагацца будзь гатоў,
З няволі рвіся ўсцяж да волі,
З сабою разам кліч братоў!

Радзіма мужных патрабуе,
Нязломных іх, у барацьбе,
Бо толькі моцны дух ратуе,
І дасць свабоду ён табе.

1944 г.

ВЕРАБЕЙЧЫКІ

На астрожнае акно
Падаюць сняжынкі.
Сыплю я туды штодня
Хлеба акрушынкі.

Для крылатых пеюноў
Снеданне рыхтую,
Верабейчыкаў-сяброў,
Чым магу, частую.

І спяваюць мне ў акне
Шэрыя клубочкі,
Пацяшаюць сэрца мне
З рання і да ночкі.

Верабейчыкі мае,
Шэранькія птушкі,
Паляціце вы хутчэй
Да маёй дачушкі!

І скажыце, што ў турме
Цяжка я гарую
Ды па пташачцы маёй
Вельмі тут сумую.

1944 г.

АСТРОЖНАЯ ПЕСНЯ

Не вянкамі зялёнымі з ружамі,
Што паклала вясна на мурог,
А цяжкімі мурамі абкружаны,
Грозны высіцца, строгі астрог.

Дажджу кроплі на шыбах брыльянцяцца,
Сум цяжкі на душу маю лёг
І ад думак: з сям'ёю што станецца,
Надрываецца сэрца маё.

Дні мінаюць усцяж аднастайныя:
А гадзіне чацвёртай пад'ём,
І на «спацыр» тады выганяюць нас,
Потым «каву» нішчымную п'ём.

А дванаццатай — крупкі з вадзіцаю,
У вядры колькі бульбін на дне.
Кожны вязень спяшае напіцца,
Бо наесціся нельга, о, не!

Вада ўвечар ці кава нішчымная,
Хлеба сто пяцьдзесят — грам у грам.
Да яды цяга вельмі нястрымная,
Гэтак хочацца есці ўсім нам.

А дзевятай без працы ўсе змучаны,
Праз «ваўчок» крычыць стражнік:
«Адбой!»
І, супольнай малітваю злучаны,
Мы знаходзім на нарах «спакой».

Прыйдзе ноч, тады думкі крылатыя
Лятуць плоймай да роднай сям'і,
Туды, вёска дзе з роднымі хатамі,
Дзе загончыкі роднай зямлі.

Не даюць нам заснуць думы цяжкія,
Мучыць белая нас «жамяра» [1],
Галава ўсім баліць ад «парашкі» нам,
Ледзь прыжджэм, калі блісне зара.

Кроплі дождж ыку слёзамі пэрляцца
На маленькім астрожным акне.
Няўжо вольніца-воля не вернецца
Аніколі ў жыцці да мяне?

І трывога мне сэрца закратае,
Я і дождж разам песню пяём.
Там далёка, далёка за кратамі,
Недзе цепліцца шчасце маё...

Мучаць думкі мяне ўсцяж трывожныя,
Мітусяцца ў збалелай душы,
Што халодныя сцены астрожныя
Могуць нас тут усіх задушыць.

Дні за днямі марудныя коцяцца,
Набрынялая думка адна:
Як на волю мне вырвацца? Хочацца
Выпіць радасці чару да дна.

---

[1] Вошы.

Не магу пагадзіцца я з доляю,
Што ў астрозе прымусіла жыць,
Ані холад, ні голад не здолеюць
Іскры думкаў маіх патушыць.

А ледзь сонейка з хмараў пакажацца,
Абнадзеіць душу зноў маю,
Тады слова з мелодыяй вяжацца
І я песню аб волі пяю.

Вербы ў зелень прыбраліся ніцыя,
Гэтак хараша ў лесе цяпер,
Адзін толькі па бруднай вязніцы я
Тут хаджу,
як затраўлены звер.

І слабымі павольнымі крокамі
Меру горкай пакуты я час,
І як быццам зусім ненарокам я
Ўспамінаю аб волі не раз.

Я б хацеў стацца птушкай крылатаю,
Паляцеў бы па шчасце сваё,
Разлучыцца каб з доляй праклятаю,
Каб заліцца на ноч салаўём.

Так хацеў бы я з светлымі крозамі
У шаўковай траве патануць,
З кучаравымі разам бярозамі
Заспяваць бы пра май,
пра вясну.

Веру — доля не будзе ўсё ж лютаю,
Я спаткаю на волі жыццё,
Развітаюся ўрэшце з пакутаю,
Адшукаю і шчасце сваё.

Беларусь! Беларусь мая любая!
Ці боль чуеш сардэчны ты мой?
Ты не дай, каб дайшоў тут да згубы я
За халоднай астрожнай сцяной!

Не вянкамі зялёнымі з ружамі,
Што паклала вясна на мурог,
А цяжкімі мурамі абкружаны
Грозны высіцца, строгі астрог.

1944 г.

КАЛІ ГЛЯДЖУ НА НЕБА СІНЬ...

Калі гляджу на неба сінь —
Прыпамінаю твае вочы.
Калі гляджу на твае вочы —
Прыпамінаю неба сінь.

Угледжу ледзь караляў шнур —
Прыпамінаю твае вусны.
Калі убачу твае вусны —
Прыпомню ўміг караляў шнур.

Зірну на ластаўкі крыло —
Прыпамінаю твае бровы.
Калі зірну на твае бровы —
Прыпомню ластаўкі крыло.

Пачую спевы салаўя —
Прыпамінаю твае словы.
Пачую ледзь я твае словы —
Успомню спевы салаўя.

Другой такой не знойдзеш, не!
Лепш за цябе няма на свеце!
Бо толькі ты адна на свеце
Каханне, шчасце дорыш мне!

1944 г.

Я ТАК ЦЯБЕ ЛЮБЛЮ!..

На захадзе зара паволі пагасала.
Бярозавы лясок ціхусенька шумеў.
На развітанне мне ты слова не сказала,
Што так цябе люблю,
сказаць я не пасмеў.

Ты адышла, а я застаўся адзінокі,
Заныла ўся душа і сэрцайка маё.
А хмарачкі штораз зближаліся здалёку,
І чарадой кружыла варанне.

Я знаю,
што адна ты жыць не маеш сілы,
Вярніся да мяне!
Я так цябе малю!
Гатоў з табою жыць,
ісці ў адну магілу!
Я так цябе люблю!
Я так цябе люблю!

1944 г.

КРАСКІ

Стаялі на стале у шклянцы краскі,
Што у дарунак май даў з роднае зямлі,
І веяла ад іх вяснянай, цёплай ласкай,—
Хоць сцятыя нажом, яны яшчэ цвілі.

Мінула колькі дзён, і красачкі завялі
І мёртвыя стаяць, як без патрэбы рэч,
А за сваю красу падзяку атрымалі —
На смецце за акно іх выкінулі прэч.

І нашае жыццё завяне, нібы краскі,
Ды згадка застанецца па былых сябрах,
І ў наш апошні шлях мы не спазнаем ласкі,
Хоць сэрца б'ецца ў стомленых грудзях.

У чаканні расстрэлу.
1944 г.

ТУГА РВЕ ДУШУ МНЕ

Туга рве мне сэрца, як воўк той галодны,
А сэрца баліць і баліць.
Да роднай сям'і у далёкі край родны
За думкаю думка ляціць.

Напэўна, там слёзы па мне праліваюць,
Не ведаюць, дзе я цяпер.
Вязуць мяне ўдаль, а куды — сам не знаю,
Бы ў клетцы зачынены звер.

Даюць мне кавалачак горкага хлеба,
Дзве місачкі ў дзень баланды,
Памерці не можна, пражыць, аднак, трэба,
Хоць з кубка халоднай вады.

Мінаю чужыя і месты і вёскі,
Што ў горах, далінах ляглі,
Мінаю сады, прамільгнулі палоскі
Чужой незнаёмай зямлі...

Аднойчы над ранкам
цягнік затрымаўся,—
Я сніў аб радзіме маёй,—
І чуў, як чароўна ў гаі заліваўся
Над рэчкай не наш салавей.

1944 г.

ПАЧУЎ Я СЁННЯ ЖАЎРУКА

Пачуў я сёння жаўрука,
Што песняй звонкай заліваўся;
Прамень убачыў сонца я,
Што чула з неба ўсміхаўся.

Надзея ў сэрцы ажыла,
Што скончыцца маё цярпенне,
Вясна жаданая прыйшла,
І прыйдзе, пэўна, вызваленне.

Міне цяжкім няволя сном,
Да хаты роднае вярнуся
І разам з другам-жаўруком
Я песняй звонкаю зальюся.

1944 г.

Раздзел трэці

ВЕРШЫ РОЗНЫХ ГАДОЎ

БУРА

Свішча, рвецца і галосіць
З поля жудасна віхор,
Як з мяцеліцай заносіць
Снегам вёскі, поле, бор.

Бура скача, бура плача,
Бура енчыць ля варот.
Занясе за ноч, няйначай,
І хаціну, і гарод.

ТО НЕ ЗОРКА УЗЫШЛА...

То не зорка ўзышла,
На якую дзіўлюся,—
То сястрыца мая,
Дарагая Маруся.

Жаль-тугу развядзе,
Растлумачыць так гожа
І паможа ў бядзе
Шчырым сэрцам, як можа.

Ці то ўдзень, ці ўначы,
Для яе без разбору,
Рада ўсім памагчы,
Шчасце ў нас, а ці гора.

Там не зорка ўзышла,
На якую дзіўлюся,—
Там сястрыца мая,
Дарагая Маруся.

МЕСЯЦ

Месяц ў ставе мые твар
Ды купаецца,
Ручніком з пуховых хмар
Выціраецца.

З ВЯСЕННЯЙ ПЕСНЯЙ

З вясенняй песняй
вецер зіму ад нас гоніць.
У праменнях сонца зелянее рунь у палях.
Угары жаўрук званочкам срэбным звоніць,
А сэрца б'ецца жыва, радасна ў грудзях.

ЖАЎРУЧОК

Раззвінеўся песняй звонкай
Ў небе, сонечным, блакітным,
Над радзімаю старонкай
Жаўручок над полем жытнім.

НАД ШЧАРАЙ

Слонімскі вальс

Вечар. Над Шчарай лягла
Белым прывідам імгла.
Вецер заціх, не шуміць.
Сном веснавым Слонім спіць.

Толькі адзін я не сплю —
Сэрца баліць, бо люблю!
Меру за крокам я крок,
Мчыць са мной думак паток...

Ноч. А над Шчарай лягла
Дзіўным прывідам імгла.
Вецер заціх, не шуміць.
Сном веснавым Слонім спіць.

НЕ ГУДЗЕ ЗЯЛЁНАЯ ДУБРОВА

Памяці сяброў-вязняў,
закатаваных
у лагеры смерці Калдычэва,
прысвячаю

Не гудзе зялёная дуброва
Над старонкай роднаю маёй,
Толькі вецер жаласна й сурова
Без канца галосіць тут па ёй.

Сном магільным спяць дубы-асілкі,
Сцяла іх варожая рука,
Толькі пні, як помнікі-магілкі,
Раняць душу й сэрца земляка.

Ды навокал сумныя бярозы,
Пахіліўшы голавы свае,
Па дубах сірочыя льюць слёзы,
Клятву помсціць злыдням лес дае.

Прыйдзе час шчаслівы, лепшы, новы,
Поўнымі грудзьмі ўздыхнем мы ўсе,
Загудзе нам новая дуброва
У новай славе, велічы, красе!

ЛІСТ ДА СЯСТРЫ АЛЕСІ

«...Да нас пpыляцелі шпакі і жаўрукі.
Ідзе вясна...»

Алеся

Здаецца мне, што быццам чую
Я свіст шпакоў, спеў жаўрукоў.
Сястру Алесю дарагую
Я чую, бачу сэрцам зноў.

О, сонца, сонца залатое,
Што грэеш родныя палі,
Прысніся мне ты, дарагое,
З красою роднае зямлі!

КРАСАЧКІ ЛЮБЫЯ

Красачкі любыя з роднай зямлі,
Вы да мяне сёння ў госці прыйшлі,—
Сніўся наяве мне дзень веснавы,
Сэрца самотніка цешыце вы.

Подых я чую радзімых лугоў,
Чую я гоман зялёных дуброў,
Чую ў блакіце я спеў жаўрука,
Чую, як плюскае хваляй рака.

І не адзін на самоце ўжо я —
Разам са мной Беларусь тут мая...

ЗАКІГІКАЛІ ЧАЙКІ

Закігікалі чайкі за вёскай,
Хоць мяцеліца снегам мяце.
Над радзімаю нашай палоскай
Усё ж вясна-прыгажуня ідзе.

Прыбярэ ў зелень нашыя дрэвы,
Дыванамі пакрые лугі,
Пад вяснянага ветру напевы
Закрасуе наш край дарагі.

Жаўрук дробна званочкамі звоніць.
У дуброве зязюля куе.
Шпак у садзе аб нечым гамоніць,
Белы бусел па небе плыве...

Закалышуцца родныя нівы,
Красак прыгаршчы кіне вясна.
Ураджайны год будзе, шчаслівы,
Так цяпер абяцае яна.

А за вёскай кігікаюць чайкі,
Абуджаюць зямельку ад сну.
Кучаравяцца хмарачак стайкі,
І вітае жывое вясну.

БОЛЬ МОЙ — ХАТЫНЬ

Сэрца, не кліч, бо яны не пачуюць
Ні сёння, ні заўтра —
іх клікаць дарма!
Ніколі не прыйдуць і не паратуюць
Мяне ад пакуты,— бо іх няма.

Мушу ісці, затаіўшы трывогу,
Шляхам самотным — заўсёды адзін.
Сумных наперадзе дзён яшчэ многа,
Многа цяжкога цярпення гадзін.

Суджана мне жыць без радасці й долі,
Жыць без сям'і, без жаданых удач.
Не, не забуду я любых ніколі!
Сэрца, не плач! Сэрца, не плач!

ЦЯРНІСТЫ ШЛЯХ

Паэма

Да цябе пішу я,
Беларусе родны,
Шчыры Якуб Колас,
Наш паэт Народны!

Твой партрэцік шэры,
Выцяты з газеты,
Беражна хаваю
Пры сабе дагэтуль.

А за полем-лугам
Срэбнаю істужкай
Цапра праплывае —
Дробная рачушка.

Калі паны-шляхта
Край наш зваявалі,
Волю-долю нашу
І зямлю забралі,

Я тады яшчэ быў
Хлопчыкам маленькім,
Але памятаю
Добра, добра ўсенька.

Як гарэлі вёскі,
Як стагналі людзі
Пад пятою панскай,
Думалі:
«Што будзе?»

Бацькаўшчына наша
У агні палала,

Акупантаў банда
Край наш руйнавала.

Запалалі гумны
Случчыны багатай,
Запалалі хаты
Ад паноў заклятых.

І на нашу вёску,
Дзе жылі мы ціха,
Наляцела гора,
Наляцела ліха.

Панская нагайка
Страшна засвістала,
Смеху і вяселля
Больш у нас не стала.

Раз да нас уланы
З крыкам прыскакалі
І кудысьці дзядзьку
Тамаша забралі.

З вёскі паўцякалі
Жыхары ў дуброву
І з сабой забралі
Коні ды каровы.

Я быў сын бядняцкі:
Не было скацінкі,
Ні гумна, ні свірна,
Ні свае хацінкі.

Ў торбу ўзяў кавалак
Чорнага я хлеба,
У рукі кій сукаты,
Ножык для патрэбы

І паклаў на грудзі
Ля шытой манішкі
Сэрцу свайму любае —
Родныя мне кніжкі.

Цётка Стэфка ў Слуцак
Некалі хадзіла
І з сабой ад брата
Кніжак захапіла.

«На табе, Сярожык!» —
Цётка так сказала
І чатыры кніжкі
Мне падаравала.

Прытуліў да сэрца
Моцна скарб свой новы,
Басанож пайшоў я
Да свае дубровы.

І было, было ў нас
Радасці нямала:
Цётка, Багушэвіч,
Колас і Купала!

З намі яны разам,
Час ад працы ўзяцца,
За зямлю, за волю,
За народ змагацца!

Цётка, Багушэвіч
Мяне захапілі,
Колас і Купала
Сэрца паланілі.

Прызнаюся шчыра —
Праўда сэрцу люба —

Палюбіў я вершы
Коласа Якуба.

Пад зялёным дубам,
Велічным, магутным,
Ўселіся сяляне —
Мой народ пакутны.

Слухаюць уважна
Тое, што чытаю,
Што паэты кажуць
Праўду, што світае.

Што зямлю здабудзем,
Што здабудзем волю,
Служкамі не будзем
Панскімі ніколі!

Слухаюць уважна
Тыя вершы-песні,
Што на мове роднай
Нам паэты весцяць.

Страсянуў чупрынай
Дуб мой кучаравы,
На расе зайгралі
Дыяментам травы.

Стайкай пралятаюць
Хмаркі ў небе сінім,
Лісцейка трапеча
На сівой асіне.

Сонца з неба песціць
Мяне ветлай ласкай,
Мне шапочуць дрэвы
У лесе песні-казкі.

Вогнішча пажараў
Яшчэ не астыла.
Многа перадчасных
Выраслa магілаў.

А у нашым лесе,
А у нашым полі
Згінула вяселле,
Згінула і доля.

І мяжой разцялі
Нашыя палоскі,
Родныя ад родных
Аддзялілі вёскі.

Слёзы горла душаць.
Стаў я ды дзіўлюся:
Зранілі ўсе грудзі
Маці-Беларусі!

Па маім народзе,
Па спіне сялянскай
З посвістам гуляе
Біч крывавы панскі.

І ў грудзях юнацкіх
Помста закіпела,
Прысягнуў змагацца
Я за волю смела.

Згінулі пасевы,
Лісце вецер вее,
Ды не можа згінуць
Нашая надзея,

Што прыжджэм мы шчасця,
Прычакаем долі,

Загуляем смела,
Радасна на волі.

Назбіраў на лузе
Я бярэмя кветак,
З іх сплятаю песні
Для старых і дзетак.

Я наладзіў ліру,
Па струнах ударыў,
З той пары па свеце
З песняй крочу ў пары.

Цяжка жыць сялянам
У панскай паняверцы,
І складаў я песні
Так, як кажа сэрца.

Паляцела песня
І жыве ў народзе.
Не падрэжа крылляў
Вораг ужо! Годзе!

Паплыла да сонца,
Паплыла над борам,
Песню маю людзі
Падхапілі хорам.

Не пайшла ў палацы,
А пайшла пад стрэхі
Бедных хат сялянскіх —
Людзям для пацехі.

Дзед Іван старэнькі
Даланёй шырокай
Выцер з твару слёзы,
Што сплывалі з вока.

Пацяшаў мой бацька
Так мяне, хлапчышку:
«Мы зямлі не маем,
Брацца след за кніжку.

І сам навучайся
І братам паможаш
Вырвацца з няволі
Лютае варожай!»

Адзвінелі косы
На лугах зялёных,
Пазжыналі збожжа
На усіх загонах.

У садах паспелі
Яблыкі ды грушы,
Залатое лісце
Вецер расцярушыў.

Апусцілі вецце
Белыя бярозы,
Праліваюць хмары
З неба дожджык-слёзы.

Па гасцінцы Слуцкім
Шпарка конік мчыцца:
Вязе мяне бацька
У Нясвіж вучыцца.

А за мной няспынна
Мчацца скрыпкі зыкі,
І мне ўсцяж здаецца —
«Сымона-музыкі».

Закружыў сняжынкі
Вецер матылькамі,

Кінуў іх на дрэвы,
Кінуў пад кустамі.

Вось канец вучэнню.
Я —
    у роднай хаце.
Ды не давялося
Мне адпачываці.

Ўлетку мая мама
З сястрой жыта жала
І бяды ліхое
Нат не прачувала.

Дэфензівы служкі
Да мяне прысталі,
Ворагам назвалі
І арыштавалі.

Бачыла ўсё гэта
Цётачка Тахвіля,
Ўпала на калені
І загаласіла:

«А мой ты Сярожык,
Без віны ніякай,
Што з табою робяць
Панскія сабакі?!»

. . . .

Адзіночная камера на паліцэйскім пастарунку ў Салтанаўшчыне. Пасля польскі суд «гродзкі» ў Нясвіжы асудзіў мяне на пяць гадоў ссылкі ў глыб Польшчы ў Паморскае ваяводства.

Мінулі гады...

Збыліся прароцтвы
Слоў тваіх, паэце:
Слава Беларусі —
Любы, добры ў свеце.

Сёлета гадочак
Выпаў ураджайны,
І плывуць па полі
Дужыя камбайны.

Дзе б ні давялося
Мне цяпер памерці,—
Колас і Купала
Назаўсёды ў сэрцы.

Раздзел чацвёрты

ТВОРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

ПАСТУШКА

Сонца ледзь блісне на ўсходзе,
Ганечка малая
Мігам з хатачкі выходзе —
Гусак выганяе.

Абіваюць гускі росы.
Ганечка спявае
І маленькай ножкай босай
Па траве ступае.

«Гэй, вы, гускі мае белы,
Хадзіце па полі,
Рвіце траўку сабе смела,
Баўцеся на волі!»

Белы гусі беспрыстанку
Весела гагочуць,
Нібы: «Добра, добра, Ганька!»
Выказаць ёй хочуць.

А сама пастушка борзда
Пад кусток сядае
І з кужэльненькае торбы
Кніжачку вымае.

Статак гусачак зялёну
Травачку з'ядае,—
Цікавенькую кніжку
Ганечка чытае.

Разгарыцца сонца —
Кніжачку схавае
І галінкаю дадому
Гусак заганяе.

«Гэй, вы, гускі мае белы,
Мілыя крылаткі!
Як наеліся вы траўкі,
Гэй, у цень да хаткі!»

1927 г.

ЗАЙЧАНЯТКІ

Пад наглядам любай маткі
Танцавалі зайчаняткі,
Танцавалі, падпявалі,
Лапкай такты адбівалі.

То яны ўсё бокам, бокам,
І ўпрысядку, і з падскокам!
Танцавалі ўлева, ўправа,
Так прыгожа і так жвава.

Ім да самае зары
Дзьмулі ў трубы камары,
На цымбалках конік граў,
Жаўраначак памагаў.

Потым мама павяла
Іх да самага сяла,
Дзе капусты поўны клеці,—
Там і ўбачылі іх дзеці.

Дзімка з Юркам, што зрабілі?
Бочку ўмомант прыкацілі
І ў яе — шусь зайчанят,—
Дзімка рад, і Юрка рад.

Ды сказаў хлапцам Сярожа:
«З зайкаў здзеквацца нягожа!
Ім на волі трэба жыць,
Іх не трэба нам губіць.

Вас у бочку пасадзіць —
Дык пачнеце слемзарыць.
Брыдка мучыць зайчанят!
Аднясіце іх назад!»

Засаромленыя дзеці
Вочы дзе не знаюць дзеці.
Дзімка крыху памаўчаў
І да Юркі так пачаў:

«Праўду нам сказаў Сярожа —
Загубіць маленькіх можам.
Аднясём лепш іх назад,
Вушанястых зайчанят!»

Як сказаў ён, так зрабілі:
На мяжы іх адпусцілі.
Далі зайкі драпака,
Пыл клубіцца, як мука!

Хлопцы весела смяюцца,
Сэрцайкі іх шчасцем б'юцца.
І бягуць назад да хат,—
Дзімка рад, і Юрка рад.

Ну, а ў лесе зайкаў мама
Была радая таксама
І ад радасці нямала
Слёзаў шчасця пралівала.

Зайкі мігам хор сабралі,
Песню пра дзяцей пялі,
Добрых дзетачак хвалілі,
Што у лес іх адпусцілі.

Потым дружна каля маткі
Танцавалі зайчаняткі,
Танцавалі, падпявалі,
Лапкай такты адбівалі.

То яны ўсё бокам, бокам,
І ўпрысядку, і з падскокам!
Танцавалі ўлева, ўправа,
Люба, міла, гожа, жвава.

Ім да самае зары
Дзьмулі ў трубы камары,
На цымбалах конік граў,
Жаўраначак памагаў...

Я ў гасцях у зайкаў быў,
Аб іх песеньку злажыў.
Падабаецца ці не?
Напішыце, дзеткі, мне!

1944 г.

ВОЖЫК

Выйшаў у садок Сярожык,
Зірк: сядзіць пад кустам вожык.
Ён скруціўся ў клубочак,
Паказаць свой нос не хоча.

Зоя з Іраю прымчалі,
Той клубочак аглядалі.
А пасля сказаў Сярожык:
— Хай жыве ў нас дома вожык.

І карміць мы будзем самі.
Панясём, пакажам маме,
Хустку я злажу ў дзве столкі,
Не паколюць рук іголкі.

Ды не хоча есці вожык,
Спаць не йдзе на мяккі ложак,
І нарэшце ён уцёк
У цямнечу,
у куток.

За ляском сядала сонца,
Глянуў вечар праз аконца.
Зоркі неба асвяцілі.
Дзеці тварыкі памылі,
Каб здаровымі ўставаць,
І пайшлі у ложкі спаць.

Раптам чуюць у трывозе:
Ходзіць нехта па падлозе!
Іра з Зояй кажуць:
«Ах!
Нас палохаць хоча страх!»

Але ім сказаў Сярожык:
— Гэта нас трывожыць вожык,
Мышак наш калючы ком
Коле голкай, як штыком.

1944 г.

БОЙ

Ой, які прыгожы мой
Цюцік, што завецца Бой,
З чорнай спінкай,
сівы ледзь
І калматы, як мядзведзь.

Поўсць ягоная, як шоўк,
Зубы скаліць ён, як воўк,
А кудлатка-галава,
Сапраўды, нібы у льва.

Гаўкне — аж зямля дрыжыць!
Найсмялейшы пабяжыць,
Уцякае, хто куды,
Каб чым далей ад бяды.

Ды вы, дзетачкі, смялей!
Вельмі любіць Бой дзяцей,
У любы прыходзьце час,
Не пакрыўдзіць Бой мой вас.

Белым хвосцікам махне,
Рукі ветліва лізне:
«Не пабруджу вас, не, не!..
Лапкі белыя ў мяне!..

Мушу вам яшчэ сказаць,
Лапку ўмею падаваць!..»
Вось які разумны мой
Верны, шчыры цюцік Бой!

1944 г.

НА КУПАЛЛЕ

Сонца села за гарою.
І тады Дзядок
Кій дубовы ўзяў з сабою,
Выйшаў у гаёк.

Ажно чуе:
гоман нейкі,
Птушачка ляціць.
«Ах, Дзядок
мой даражэнькі,
Буду вас прасіць:

Працавала шмат я часу,
І гняздо звіла,
І маленькіх птушанятак
Ціха прывяла.

Ды нядаўна хлопец рыжы
Злосна пакараў —
Дарагіх мне дзіцянятак
Ён з сабой забраў».

Птушка скончыла.
Над ёю
Віўся матылёк,
Гаварыў ён з неспакоем:
«Любы мой Дзядок!

Сам ты, пэўна, добра бачыш:
Цяжанька мне жыць!
Хлопец змяў мне ўчора крыллі,
Як мне не тужыць?»

Далей к Дзеду падыходзіў
Сіні васілёк
І таксама з жалем горкім:
«Міленькі Дзядок!

Неахайніца сарвала
На мяжы мяне,
На назе маёй зялёнай
Рана ўсё не схне;

Папрасі ж ўсіх ты дзетак
Красачак не рваць
Для таго, каб потым злосна
Мяць іх і таптаць».

А за красачкай прыдыбаў
Шэранькі грыбок,
Капялюшык зняў і кажа:
«Так, любенькі Дзядок!

І мяне сарвалі дзеці,
Кінулі набок,
А хіба ж я не харошы
Баравік-грыбок».

Да малых Дзядок падаўся,
Хоць у снах сказаць,
Што усё ў прыродзе трэба
Шчыра шанаваць.

1954 г.

КАМАРЫ

Будзе заўтра пагода:
камары мак таўкуць.
З беларускага фальклору

Ад зары
І да зары
Над ракою
Камары
У дуду сваю
Гудуць
Ды у ступе
Мак таўкуць.

Заўтра будзе
Добры дзень —
Ані хмарачкі
Нідзе!
Недарма ж яны
Гудуць
Ды у ступе
Мак таўкуць.

1954 г.

НАШ САД

Зіхаціць на сонцы сад
Залатым пажарам,
Быццам выйшаў на парад
З восеньскім ён дарам.

У паветры зжоўклы ліст
Кружыцца дукатам,
Засцілаючы зямлю
Дываном стракатым.

І праз дрэвы ў дзённы час,
І праз неба просінь
Усміхаецца да нас
Залатая восень.

НАД КАЛЫСКАЙ

На зямельку ночачка
Сіняя прыйшла.
Засні, мая дочачка,
Любая мая!

Над тваёй калыскаю
Буду я пяяць,
Пра ката ды з мышкаю
Казачку казаць.

Заўтра ўстанеш раненька,
Будзеш зноў гуляць
І па-свойму песенькі
Дзіўныя пяяць.

Пад акенцам кветачка
Цудная цвіце.
Мая крошка-дзетачка
З дня на дзень расце.

Вунь высока зорачка
Золатам блішчыць,
А малютка-дочачка
Чамусьці не спіць.

З-за хмарынкі месячык
Беленькі ідзе,
За сабою зорачак
Карагод вядзе.

Заплюшч свае вочачкі,
Дочанька мая,—
Бо на зямлю ночачка
Сіняя прыйшла.

НЕ ПАЖАР ГАРЫЦЬ

Не пажар гарыць на ўсходзе
За чупрынамі бяроз,—
Гэта сонейка ўзыходзе
Ў залацістым бліску кос.

Стройна, згодна, ў дружным ладзе
Загрымеў птушыны хор,
Як аркестрам на парадзе,
Ён вітае сонца ўсход.

На бярэзіне зялёнай
Пераліўна неяк так
Нізкім і высокім тонам
Развясёла свішча шпак.

Пах чаромхі ап'яняе,
А зірнеш — пад ёю ўніз,
Белай зоркаю бліскае
Паміж зелені нарцыз.

А там далей незабудкі
Поруч шоўкавай травы
Нешта шэпчуць нам ціхутка
У светлы ранак веснавы.

Як чароўная паненка,
У садзе яблынька стаіць,
Бела-ружавай сукенкай
Ў косах сонца зіхаціць.

Неба песціць цёплай ласкай,
Ні хмурыначкі нідзе,
Мёд збіраючы, на красках
Пчолка весела гудзе.

То не скрыпка чула грае,
То не спевы салаўя,
Сэрца песенькі спявае,
І пяе душа мая.

РАНІЦАЙ

Эх, насыпала праз ночку
Многа белага сняжочку!
Голькі дрэў абвіслі ўніз —
Гэтак снег на іх навіс.

Спіць у казачным убранні
Сад зімовы нат і ўранні.
Каб на цуд той падзівіцца,
Прыляцеў снягір з сініцай.

Мілым птушачкам я рад,
Дам ім прыгаршчы зярнят.
Хай шчабечуць пад акном,
Покуль зноў вясны прыжджом.

У МЕСЯЧНУЮ НОЧКУ

У месячную ночку,
Калі спіць зямля,
Льецца срэбрам звонкім
Песня салаўя.

Спудзіцца на дрэвах
Соннае лісцё,
Зашуміць над рэчкай
Буйнае трысцё

І зноў засынае,
Не сплю толькі я,
Бо мяне чаруе
Песня салаўя.

ЗМЕСТ

Песня клікала ў свет. *Прадмова Алега Лойкі* 3

Раздзел першы

РАННІЯ ПЕСНІ

Зорачкі 7
Зіма 9
Вячоркі 9
Чалавек і птушкі 10
Жыццё 11
Лістапад 11
Ночка 12
Ніва 13
Казка 14
Музыкай вяснянаю... 14
Засмяецца вясна 15

Раздзел другі

АСТРОЖНАЯ ЛІРЫКА

Сёння ўночы... 16
Ноч у вязніцы 17

Шэры дом 18
Забралі сонца ад мяне 18
Ноч у камеры 19
*** Шчаслівым будзе той заўсёды... 20
*** Кажы заўсёды праўду смела... 20
Бярозы 21
Белы снег 22
Не падай духам ты ніколі! 23
Верабейчыкі 23
Астрожная песня 24
Калі гляджу на неба сінь... 27
Я так цябе люблю!.. 28
Краскі 29
Туга рве душу мне 29
Пачуў я сёння жаўрука 30

Раздзел трэці

ВЕРШЫ РОЗНЫХ ГАДОЎ

Бура 31
То не зорка ўзышла... 32
Месяц 32
З вясенняй песняй 33
Жаўручок 33
Над Шчарай 33
Не гудзе зялёная дуброва 34
Ліст да сястры Алесі 34
Красачкі любыя 35
Закігікалі чайкі 35
Боль мой — Хатынь 36
Цярністы шлях (паэма) 37

Раздзел чацвёрты

ТВОРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Пастушка 46
Зайчаняткі 48

Вожык 50
Бой 51
На Купалле 52
Камары 54
Наш сад 55
Над калыскай 56
Не пажар гарыць 57
Раніцай 58
У месячную ночку 58

Новік-Пяюн С.

Н 73 Заўсёды з песняй: Паэма, вершы, песні, творы для дзяцей/[Прадм. А. Лойкі].— Мн.: Маст. літ., 1984.— 62 с.

20 к.

Чытачы ўжо знаёмы з творчасцю Сяргея Новіка-Пеюна па зборніку вершаў «Сцягі і паходні», у якім прадстаўлена творчасць паэтаў былой Заходняй Беларусі.

Аўтар — адзін з актыўных літаратараў таго часу. У гэтай кнізе сабраны яго лепшыя творы.

$Н \frac{4702120200-062}{М 302(05)-84} 64-84$

ББК 84Бел7

Бел2

Сергей Новик-Пеюн
(Сергей Михайлович Новик)

ВСЕГДА С ПЕСНЕЙ

Поэма, стихи, песни,
произведения для детей

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар *Р. М. Яўсееў.* Мастак *У. М. Жук.* Мастацкі рэдактар *А. М. Малышава.* Тэхнічны рэдактар *А. Б. Барадзіна.* Карэктар *К. А. Крукоўская.*

ІБ № 1982

Здадзена ў набор 07.12.83. Падп. да друку 29.02.84. АТ 01056. Фармат $70\times90^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 2,34. Ум. фарб.-адб. 2,63. Ул.-выд. арк. 1,98. Тыраж 3000 экз. Зак. 4264. Цана 20 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.